і інш.), а таксама праз культуразнаўчыя тэксты, якія адлюстроўваюць разнастайныя праявы культуры беларускага народа (звычаі, побыт, каштоўнасці і інш.)

Плюсы работы ў профільных класах відавочныя. Па-першае, гэта павелічэнне колькасці гадзін да 3 ( можна і больш). Другое, невялікая колькасць вучняў, што дае магчымасць ажыццяіць аобасна-арыентаваны падыход да кожнага. Па-трэцяе, свядомае самавызначэнне і выбар прадмета, які будзе вывучацца на павышаным ўзроўні, што грае немалаважную ролю, бо значна прасцей працаваць з мэтанакіраванымі, матываванымі навучэнцамі.

Асноўным крытэрыем выбару метадаў і сродкаў навучання ў такім класе з'яўляецца ўзровень падрыхтаванасці навучэнцаў, сфарміраванасці ў іх прыемаў вучэбнай дзейнасці, агульнавучэбных уменняў і навыкаў. У мяне ў класе вучні прыблізна аднаго ўзроўню падрыхтаванасці, што значна аблягчае работу.

Усе яны будуць здаваць ЦТ або ЦЭ па беларускай мове, таму ўся мая дзейнасць накіравана на гэта. Я пабудавала сваю работу наступным чынам: вывучаемы матэрыял разбіла на пэўныя блокі, модулі згодна з праграмай, і пасля пэўнага раздзелу мы выконваем тэматычныя тэсты, заданні, практыкаванні , накіраваныя на адпрацоўку практычных навыкаў і ўменняў, у дадатак да тых практыкаванняў і заданняў, якія змешчаны ў падручніку. Напрыклад, прайшлі правапіс вялікай літары і правапіс слоў асобна, разам, праз дэфіз выконваем тэсты гэтай тэматыкі, прайшлі тэму фанетыка і арфаэпія, выконваем заданні гэтага тэматычнага блоку і г. д.

Так як вучню профільнага класа неабходна засвойваць вялікі аб'ем інфармацыі, то яе мэтазгодна прадстаўляць у сціснутай форме ў выглядзе памятак, апорных схем, інструкцый, алгарытмаў, блок-схем, табліц. Безумоўна, гэта патрабуе ад настаўніка часу на падрыхтоку, але дае магчымасць больш грунтоўнай падрыхтоўкі для вучняў, тым больш, што яны, як ніхто іншы, у гэтым зацікаўлены. Як паказала практыка, асноўнай формай арганізацыі ўрока ў профільным класе з'яўляецца урок-практыкум. Пры адсутнасці тэарэтычнага матэрыялу ў падручніку — урок-лекцыя.

**Заключэнне.** Вывучэнне вучэбных прадметаў на павышаным узроўні скіравана на будучую прафесійную адукацыю навучэнцаў, развіццё іх індывідуальных здольнасцей шляхам больш глыбокага, чым прадугледж-ваецца базавым курсам, засваення асноў навук, сістэматычных ведаў па вучэбным прадмеце.

УДК 811.161.3

**І. А. Ганчарова**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва», Магілёў, Рэспубліка Беларусь*

## РАБОТА З АДОРАНЫМІ І ВЫСОКАМАТЫВАВАНЫМІ ВУЧНЯМІ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА АЛІМПІЯД ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

**Уводзіны.** Творчыя здольнасці — гэта дар прыроды. Распаўсюджана меркаванне, што калі ў чалавека ёсць талент, то ён нікуды не падзенецца, не знікне і абавязкова дзе-небудзь з'явіцца. Ёсць нават прымаўка: «Талент заўсёды зробіць сваю справу». Аднак даследаванні абвяргаюць гэты пункт гледжання. Талент існуе толькі ў пастаянным руху: ён альбо развіваецца, альбо згасае. Зразумела, што не кожны стане вялікім, але кожны мае магчымасць развівацца. Задача педагога — убачыць такіх дзяцей і дапамагчы ім рэалізаваць сябе. Як гэта зрабіць? Перш за ўсё ведайце, што характэрнымі рысамі адоранага чалавека з'яўляюцца: Дапытлівасць, звышадчувальнасць да праблем, пазнавальная самастойнасць, арыгінальнасць мыслення, гнуткасць мыслення, прадуктыўнасць мыслення, лёгкасць у падборы асацыяцый, здольнасць да прадбачання, высокая канцэнтрацыя ўвагі, выдатная памяць, здольнасць да ацэнкі, асаблівасці схільнасцей і інтарэсаў, самастойнасць.

**Асноўная частка.** У век інфармацыі і новых тэхналогій складана зацікавіць вучняў беларускай мовай, тым больш у канкурэнцыі з іншымі прадметамі. Настаўніку прыходзіцца прыкладваць шмат намаганняў для таго, каб матываваць здольных вучняў да вывучэння роднай мовы і літаратуры па-за рамкамі школьнай праграмы. Настаўніку трэба заматываваць вучня, упэўніць яго, што ён здольны на вельмі нялёгкую працу быць удзельнікам алімпіяднага руху, які патрабуе абмежаванасці ў нейкіх другіх яго інтарэсах, шмат працаваць. Настроіць яго не толькі на штодзённую работу з настаўнікам, але і навучыць працаваць самастойна. А яшчэ трэба працаваць з сям'ёй, бо, калі сям'я не зацікаўлена ў выбары дзіцяці, то ніякага поспеху не будзе. Бацькі таксама павінны уключацца ў гэтую складаную працу, матываваць дзіця на поспех.

Адной з састаўных частак падрыхтоўкі да алімпіяды з'яўляецца пазакласная работа па беларускай мове і літаратуры. Асноўным накірункам пазакласнай працы з'яўляецца практычнае выкарыстанне ведаў, набытых на ўроках мовы і літаратуры, факультатыўных і стымулюючых занятках. Разнастайныя формы пазакласнай працы (гасцёўні, вечарыны, віктарыны, конкурсы, гульні і г. д.) садзейнічаюць прывіццю навыкаў публічнага выступлення, вучаць дзяцей пераадольваць нерашучасць, развіваюць творчае ўспрымання літаратуры як віду мастацтва (для напісання водгуку). Папулярнасцю карыстаецца лінгвістычная гульня «Ведай беларускі».

Рэпазіторый БарДУ

Такія мерапрыемствы развіваюць моўную культуру, пашыраюць агульны і літаратурны кругагляд, вучаць самастойна працаваць з кнігай, развіваюць творчыя здольнасці на сцэне, у ролі экскурсавода, у складанні сцэнарыяў і віктарын.

У школе створаны спрыяльныя ўмовы для выяўлення і развіцця высокаматываваных вучняў. Штогод у кастрычніку праводзіцца інтэлектуальны марафон па ўсіх вучэбных прадметах для вучняў I—XI класаў, вучні актыўна ўдзельнічаюць у інтэлектуальным конкурсе «Буслік».

Як вядома, матывы падзяляюць на знешнія і ўнутраныя. Знешнія матывы зыходзяць ад педагогаў, бацькоў, класа, грамадства ў цэлым і набываюць форму падказак, намёкаў, патрабаванняў, указанняў ці нават прымусу і іх дзеянне нярэдка вызывае супраціўленне асобы вучня. Матывацыя вучняў з боку настаўніка (бацькоў) паспяховая настолькі, наколькі яна супадае з яго ўнутранай матывацыяй, якая, дарэчы, мае значную ролю ў прадуктыўнай пазнавальнай дзейнасці школьнікаў. Таму адной з асноўных задач настаўніка з'яўляецца павышэнне ў структуры матывацыі вучняў удзельнай вагі ўнутранай матывацыі навучання, і адной з форм дасягнення гэтага — кіраванне актыўнасцю вучняў — актывізацыя пазнавальнай дзейнасці.

Пазаўрочныя формы і метады актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў: стымулюючыя заняткі; прадметныя тыдні; інтэлектуальныя алімпіяды; факультатыўныя заняткі; заняткі ў гуртках; конкурсы рознай накіраванасці; сістэма пазакласнай выхаваўчай работы.

Урочныя:

- развіццё індывідуальнага стылю вучэбнай дзейнасці; індывідуальная і дыферэнцыраваная накіраванасць вучэбнага працэсу;
- выкарыстанне міжпрадметнага падходу на аснове інтэграцыі тэм і прблем, якія адносяцца да розных накірункаў ведаў;
- групавыя формы работы;
- розныя формы далучэння вучняў да самастойнай пазнавальнай дзейнасці;
- заданні творчага характару;
- праектная дзейнасць.

Самыя розныя інтэрактыўныя метады і прыёмы дапамагаюць у цікавай форме засвойваць складаныя тэмы, развіваюць творчыя здольнасці вучняў, кемлівасць. Гэта могуць быць цікавыя малюнкі да правіла, вясёлыя вершы, якія дапамагаюць хутчэй асвоіць правіла, лінгвіністычныя казкі, інсцэніроўкі, крыжаванкі, шарады. На такіх занятках можна адправіцца ў краіну «Памылка» і выратоўваць мяккі знак, апостраф, або «ў». Акрамя гэтага, дзеці разгадваюць рэбусы, крыжаванкі, шукаюць схаваную літару, ловяць гукі, літары, разгадваюць загадкі.

Вялікую цікавасць у дзяцей выклікае кніга Глеба Лабадзенкі «Дзіцячая заМова» (малюнкі, якія дапамагаюць вывучаць мову цікава).

Рабяты ствараюць свае малюнкі (назвы ягад па-беларуску, кветак, грыбоў, садавіна, гародніна, тлумачаць значэнне слоў пры дапамозе малюнкаў). Каб інфармацыя добра запомнілася, складаем сказы, слоганы, вершы, міні-тэксты: «Рэцэпт майго любімага пірага», «Якія кветкі я падараваў бы дзяўчыне», «Ці карысна спажываць грыбы?», «Святочнае меню», «Варэнне ці свежыя ягады: зрабі свой выбар», крыжаванкі і г. д.

Цікавы прыём «Апрані лялькy» — добра апраўдвае сябе пры вывучэнні беларускага адзення (заданні, дарэчы, такога плану сустракаюцца ў алімпіядах). Пачынаю з вядомага адзення, потым звяртаемя да больш «вінтажнага» варыянту. Зараз прапаную паспрабаваць разам са мной.

Абавязкова прапаную скласці сказы, тэксты розных тыпаў: апісанне «Беларускі жаночы строй», «Дызайн сучаснага адзення: плюсы і мінусы», разважанні «Ці зручна было хадзіць у лапцях?», «Спадніца міні або максі?», «У чым перавага старажытнага адзення перад сучасным?» і г. д.

Слоганы пра адзенне:

1. Падкрэсліць тонкі сілуэт дапаможа вам гарсэт.
2. Для дзяўчынак з Магілёва ёсць шыкоўная панёва.
3. Калі зваць цябе Андрэйка, табе падыдзе камізэлька.
4. Саламяны капялюш вельмі любіць Танін муж.
5. Для дачушкі Веранічкі маці купіць чаравічкі.
6. Вышываную кашулю ў школу апрануў Сашуля і г. д.

**Заключэнне.** Кожны чалавек індывідуальны, кожны вучань — разгорнутая кніга з ненапісанымі старонкамі, і напішацца на іх тое, што прапануе жыццё! Задача педагога: убачыць лепшае ў вучню, убачыць тое, што схавана за памылкамі ў словах, за няроўным почыркам і няўмелымі выказваннямі, тое, што заклала ў яго прырода, вялікае, непаўторнае, яго асабістае!

Рэпазіторый БарДУ